**А.А.Дубовік,**
*аспірантка кафедры бібліятэказнаўства*

# ЭФЕКТЫЎНАЕ МІЖАСОБАСНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Сучасны стан культуры і адукацыі ў грамадстве выклікае неабходнасць пераасэнсавання выхаваўчага патэнцыялу бібліятэкі. Аналіз сацыялагічных, псіхолага-педагагічных, метадычных крыніц прывёў да высновы, што сярод разнастайных сацыяльных інстытутаў, якія садзейнічаюць развіццю асобы дзіцяці, бібліятэка выступае ў якасці важнай, але спецыфічнай структуры. З прычыны глыбокай заідэалагізаванасці бібліятэк на працягу дзесяцігоддзяў выхаваўчая, або педагагічная, функцыя вылучалася фармальна, умоўна, бо рэалізавалася без арыентацыі на рэальнага чытача, а часам і ўвогуле набывала такія непрывабныя рысы, як усеагульнае кіраванне чытаннем. Такі падыход паслужыў адной з прычын непрэстыжнасці і нізкага рэйтынгу бібліятэкі ў вачах дзіцячых чытачоў і грамадства ўвогуле.

Але сітуацыя мяняецца. У практыку айчынных адукацыйных устаноў укараняецца гуманістычна накіраваная педагогіка супрацоўніцтва. Бібліятэка для дзяцей дэкларуе сваю унікальнасць і замацоўвае ролю інстытута дзяцінства. Адбываецца пераарыентацыя на асобу як найвышэйшую каштоўнасць і галоўную мэту дзейнасці, бо ўсякі выхаваўчы працэс пазбаўляецца сэнсу, калі ён не садзейнічае ўзбагачэнню жыццёвага складу маленькага чалавека, крышталізацыі яго асобы. На старонках прафесійнага друку час ад часу з'яўляюцца матэрыялы, якія асвятляюць пытанні ўплыву сацыякультурнай сітуацыі на характар дзіцячага чытання, пытанні развіцця асобасных якасцей падчас чытацкай дзейнасці. Плённыя напрацоўкі ў гэтым кірунку маюць Л.І.Беленькая, І.Я.Лінкова, І.І.Ціхамірава, В.П.Чудзінава і інш. На нашу думку,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадзеныя падыходы да праблемы не з'яўляюцца самадастатковымі па шэрагу прычын. Перш за ўсё, бібліятэка сёння выступае не толькі (і не столькі) як месца акумуляцыі і распаўсюджання літаратурных крыніц. Чытачы ранняга ўзросту прыходзяць у бібліятэку часцей дзеля таго, каб выбраць найбольш цікавыя для іх кніжкі, наведаць тое ці іншае мерапрыемства, заняткі. Менавіта ў мікраасяроддзі бібліятэкі ажыццяўляецца працэс вольнага міжасобаснага ўзаемадзеяння, якое незаарганізавана, нерэгламентавана вучэбнай дзейнасцю, пазбаўлена строгага кантролю, як, напрыклад, у школе. Асаблівую важнасць для бібліятэчнай практыкі набываюць эмацыянальна-асобасны характар узаемадзеяння бібліятэкара і дзіцячага чытача, здольнасць бібліятэкара да такога ўзаемадзеяння, якое стымулюе творчую актыўнасць дзіцяці. У стварэнні ўмоў для творчага ўключэння дзяцей у жыццё, развіцці камунікабельнасці і мабільнасці, ініцыятывы і сацыяльнай актыўнасці і заключаецца глыбінны педагагічны патэнцыял бібліятэкі.

Зыходзячы з вышэйазначанага, праблема бібліятэчнага ўзаемадзеяння ўяўляе пэўную цікавасць і неабходнасць для комплекснага вывучэння.

У псіхалогіі міжасобаснае ўзаемадзеянне вызначаецца як форма выпадковага ці невыпадковага, прыватнага ці публічнага, доўгатэрміновага ці кароткатэрміновага, вербальнага ці невербальнага кантакту двух і болей індывідаў, вынік якога — узаемныя змены іх паводзін, дзейнасці, адносін і ўстановак. Традыцыйна вылучаюць два структурныя кампаненты міжасобаснага ўзаемадзеяння: адносіны (як яго ўнутраная характарыстыка) і суразмоўніцтва. Прафесар Я.Л.Каламінскі вызначае ўзаемаадносіны як асобасна значымае адлюстраванне людзьмі адзін аднаго, якое ўяўляе сабою іх унутраны стан; суразмоўніцтва — як паводзіны, у працэсе якіх развіваюцца, праяўляюцца і фарміруюцца міжасобасныя адносіны. Даныя ж шматлікіх навуковых даследаванняў (Я.Л.Каламінскі, У.А.Кан-Калік, А.А.Мядзвецкая і інш.)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адназначна сведчаць пра тое, што фарміраванне асобы дзіцяці адбываецца ў працэсе міжасобаснага ўзаемадзеяння з дарослымі і равеснікамі. Больш таго, у канцэпцыях развіцця асобы (К.А.Абульханава-Слаўская, Ш.А.Аманашвілі, Л.А.Бажовіч, Л.С.Выгоцкі, А.І.Кочатаў, У.А.Пархоменка і інш.) у якасці галоўнай умовы як агульнага псіхічнага, так і асобаснага развіцця ў дзіцячым ўзросце выступае эмацыянальны аспект узаемаадносін паміж дарослым і дзіцем.

Такім чынам, у апошні час узаемадзеянне разглядаецца ў якасці чалавекафарміруючага фактару. Яно мае вялікае значэнне для фарміравання інтэлектуальнай і эмацыянальнай сферы чалавека, развіцця яго волі, пачуццяў, — рацей, усіх асноўных асобасных характарыстык. Выхаваўчае ўздзеянне на індывіда мае на мэце не толькі прывядзенне яго да пэўнага, вызначанага грамадства, эталона-формы, але яшчэ і абуджэнне ўнутранай актыўнасці і цікавасці.

На жаль, традыцыйная мадэль узаемадзеяння ў бібліятэцы мела крыху іншую форму. Справа ў тым, што даросламу, у нашым выпадку бібліятэкару, адводзілася роля суб'екта ўзаемадзеяння, г. зн. ён заставаўся ўвесь час нібыта па-над чытачом, і ў прафесійныя функцыі яго ўваходзілі толькі абслугоўванне і кіраванне. Дзіця ж заўсёды было аб'ектам дадзенага актыўнага ўздзеяння. Пры такім раскладзе асабістая зацікаўленасць і ініцыятыва юнага чытача заставаліся, як правіла, па-за ўвагай. Шчырая гутарка, асэнсаванае і адухоўленае абмеркаванне твора, дапамога, увогуле творчая, нефармальная размова сталі вялікай рэдкасцю.

Для пераадолення дадзенага непрадукцыйнага спосабу ўзаемадзеяння ў бібліятэцы прапануецца асобасна арыентаваная мадэль зносін. Станаўленне эфектыўнага ўзаемадзеяння грунтуецца на эмацыянальнай аснове і рэалізуецца ў форме суб'ект-суб'ектных дыялагічных зносін. Рэалізацыя такой мадэлі ў значнай ступені залежыць ад перабудовы самасвядомасці бібліятэкара. У



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведных рэйтынгах бібліятэкараў першае месца займаюць не прафесійныя, а агульначалавечыя якасці, якія ў любой сітуацыі садзейнічаюць стварэнню псіхалагічнага камфорту ў бібліятэцы.

Прафесійная гатоўнасць бібліятэкара да рэалізацыі дыялогавай формы зносін можна разглядаць як сукупнасць трох узаемазвязаных кампанентаў:

— асобаснай гатоўнасці, яна арыентавана на паспяховае супрацоўніцтва з дзецьмі, дынамізм, эмацыянальную ўстойлівасць;

— інтэлектуальна-педагагічнай гатоўнасці — псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці, імкненне да набыцця навыкаў эфектыўных зносін і ведаў дзіцячай псіхалогіі;

— практычнай гатоўнасці — наяўнасці вопыту ў адпаведнай сферы дзейнасці і жаданне працаваць па новай мадэлі.

Эфектыўнае бібліятэчнае ўзаемадзеянне забяспечвае рэальны камфортны кантакт бібліятэкара і чытача, вядзе да пераадолення псіхалагічных бар'ераў, якія часам узнікаюць, дапамагае пераходу на пазіцыю супрацоўніцтва. Зносіны бібліятэкара і чытача будуюцца на аснове добразычлівасці і ўзаемапаразумення, што стымулюе актыўнасць бакоў у працэсе зносін, садзейнічае асобаснаму росту дзіцяці.

Такім чынам, відавочна, што эфектыўнае міжасобаснае ўзаемадзеянне патрабуе ад бібліятэкара таленту педагога і псіхолага. Гэта вядзе да адпаведных змен у працэсе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ